ДЗЯННІЦА

Вестка Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту.

Асобны №. каштуя усюды 35 кап.

№ 19

ВАРУНКІ ПЕРЭДПЛАТЫ:

	На 12 мес.	На 9 мес.	На 6 мес.	На 4 мес.	На 3 мес.	На 2 мес.	На 1 мес.
У Расеі	15р.—к.	11р.50к.	8р.—к.	5р.20к.	3р.90к.	2р.60к	1р.30к.
За граніцу	20р.—к.	18р.—к.	12р.—к.	8р.70к.	6р.—к.	4р.—к.	3р.—к.

Калі выпісваяцца разам некулькі №№, та робіцца уступка на 20%.

Перамена адрысу каштуя 50 кап.

Радакцыя і Адміністрацыя: Масква, Паварская, 52.

Масква, 1918 г. 12 Юля. — Выходзіць ня меньш чатырох разоу у месяц. — І-й год выданьня.

Канцыпярыя Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту адчыняна што дня, апроч сьвят, ад 10 г. да 4 гадзіны дню.

Къ бѣженцамъ-Бѣлоруссамъ.

Назначенный на 15 іюля (нов. ст.) 1918 года Всероссійскій Съѣздъ бѣженцевъ-Бѣлоруссовъ по сложившимся обстоятельствамъ **откладывается** впредь до болѣе благопріятнаго времени.

О днѣ созыва Съѣзда будетъ послано особое извѣщеніе.

Бѣженскій Отдѣлъ Бѣл. Нац. Комиссаріата.

Культурно-просвѣтительный Отдѣлъ Бѣлорусскаго Національнаго Комиссаріата

открываетъ въ г. Москвѣ 9 іюля н. с. бѣлорусскій народный университетъ.

На лѣтнемъ семестрѣ (9 іюля по 1 сентября) будутъ прочитаны циклы лекцій по вопросамъ:

1) Бѣлоруссовѣдѣнія (языкъ и литературу бѣлоруссовъ, исторія бѣлорусскаго народа, бѣл. этнографія и географія, народное хозяйство Бѣл., исторія національнаго и революціоннаго движенія въ Бѣл. и т. д.).

2) Соціально-политическимъ (государство и его формы, исторія соціализма, исторія народнаго хозяйства, аграрный вопросъ, исторія революціонныхъ движеній на Западѣ и въ Россіи и др.).

3) Общепедагогическимъ (трудовая школа, исторія образованія на Западѣ и въ Россіи, внѣшкольное образованіе, дошкольное воспитаніе и др.).

4 Естественно-научнымъ (философія, естествознанія, основы астраноміи, геологіи, біологіи и др.).

Въ число слушателей принимаются:

1) Учителя и учительницы народной и средней школы Бѣлоруссіи.

2) Представители отъ отдѣловъ народнаго образованія при Совѣтахъ Р. и К. Депутатовъ Бѣлоруссіи.

3) Члены бѣлорусскихъ культурно-просвѣтительныхъ организацій, а также всѣ лица, интересующіяся бѣлорусской народностью и культурой.

Занятія будутъ происходить ежедневно въ вечерніе часы (не менѣе 4 часовъ въ день).

Слушаніе лекцій безплатное.

Для пріѣзжающихъ народныхъ учителей и лицъ, делегированныхъ отдѣлами народнаго образованія и организаціями, будетъ предоставлено безплатное помѣщеніе (на 100 человѣкъ); нуждающимся, представившимъ соотвѣтствующія удостовѣренія, будетъ оказана матеріальная поддержка и оплаченъ проѣздъ.

Запись принимается по почтѣ, телеграфу и лично до 9 іюля с. г. ежедневно съ 11 до 4 часовъ въ помѣщеніи культурно-просвѣтительнаго отдѣла Бѣлорусскаго Національнаго Комиссаріата (Поварская, № 52, тел. 1-51-63).

Масква 12 юля.

Варагі сучаснаго гасударскаго парадку, як парадку, збудаванаго працоуным народам, праз увесь час стараюцца адшукваць абмылкі у працы работніча-сялянскаго правіцяльства, і усякі маленькі нядагляд разбухаюць у штось дужа велікая і страшэнная. Апроч сочкі за працаю народаго правіцяльства, гэтыя-самыя-варагі, якіх цяпер надта многа, стараюцца апаскудзіць усю палітыку і напрамак яе. Гэтым, ясна, яны хочуць зблажыць у вачу цемных людзей іх вагу і вартасць.

„Вось паглядзеця адно, — паказваюць яны — бальшавікі рахманяцца перад нямецкім валунічаствам, патураюць яму. Бальшавікі, — далій цягнуць яны — праз бойку дастаюць хлеб у весца і г. ін. Усе гэта ня дамакратычна, а воражна народу“. Кажучы гэта, паганцы гэты добра разумеюць, што яны хлусяць і брэшуць: стомляная чатырохгадоваю вайною, Расея бязмоцна, каб ізноу ваяваць, ды, к гэтаму, яна нікаліва ня падгатавана... Хлеба ж дастаць інакшым спосабам, як атабраньням ад багатых — кулакоу, гонячых з жыта самагонку, нельга. Разумеюць варагі цяперашняй улады, што яны, буць бы на іх, і гэтаго ня зрабілі б. Але казаць кажуць, навэт крычаць і гукаюць і гэта таму, што яны варагі, што як-небуць ім хочацца падлагодзіцца да селян і работнікау, каб дастаць сабе прыхільнікау — знача, боляй варагоу Радавуй Распубліца. Толькі дарэмна усе іх сударгныя лемянты! Сваею палітыкаю, калі шчэ былі у кірунку ею, яны у канец адхілілі ад сябе працоуны народ, і цяпер нічым, ніякімі абецанкамі ня прыманяць яго да сябе. Работнік і бедны селянін яскрава разумеюць той напрамак палітыкі, які вымушана рабіць упоунамочная ім правіцальства. Яны яму вераць ва усім, з гнюсавасцю глядзяць на тых, хто хоча яе заняуважыць перад іх вачмі... Дарэмны ж брэх іх. Гэта паказау і 5 усерасейскі з'езд Радау, як поунамочны прадстаунік усяго працоунаго равалюцыйнаго народу, перадсветна падмацаваушы сваю далучнасць і спагаду сваю да кірунку Радавае палітыкі поуным адабрэньням отпавядзі аб дзеях Народных Камісарау. Хай ня забываюць гэтаго усе злыдні і варагі Вялікае сацыяльнае Равалюцыі! І хай ведаюць, што усім іх крыкам цапа-грош. Нядастаць ім глебы у народзя, на якую б маглі яны абаперціся.

Новое о старомъ.

(Окончаніе)

Въ настоящее время пока еще германскіе круги, хваля бѣлорусскихъ „дѣятелей“ за ихъ „дальновидность“, привѣтствуютъ гоненіе на русскую культуру, которое называется бѣлоруссизаціей, и высказываются, что судьбы Бѣлоруссіи сейчасъ и въ будущемъ тѣсно соприкасаются и интересы связываются только съ Германіей и что единственный выходъ изъ тупика для Бѣлоруссіи— это экономическій и военно-политическій союзъ съ Германской имперіей, который открываетъ для Бѣлоруссіи широкую дорогу промежуточной державы между западомъ и востокомъ, державы, „культурные и экономическіе интересы которой больше склонны къ Германіи, чѣмъ къ Московіи“, а черезъ нѣкоторое время (Германіи хорошо извѣстно, чтобы сомнѣваться въ этомъ), а черезъ нѣкоторое время они не приминуть создать формы мѣстности, которыя соединятъ мѣстные интересы края съ общегосударственными и экономическими задачами Германіи. Наконецъ, уже Германія начинаетъ насъ считать потомками одного изъ германскихъ племенъ (готовъ) и говоритъ, что наука наша и промышленность черпали свои силы только изъ Германіи.

И въ результатѣ все клонится къ тому, что управленіе „государствомъ бѣлорусскимъ“ очутившееся не въ рукахъ свободнаго народа, который призванъ выковывать свою судьбу, а въ рукахъ и подъ ударами страшнаго и непримиримаго врага всего славянства, которое онъ хочетъ раздавить всюду, гдѣ оно ему попадается; и тогда насъ уже не спасетъ ничто отъ тѣхъ страшныхъ послѣдствій, которыя нужно предвидѣть и о которыхъ нужно думать заблаговременно.

Думали ли объ этомъ тѣ минскіе мудрецы стремясь къ созданію „незалежнай Белоруссіи“. „такой залежнасці вместо незалежнасці“,—какъ выразился на митингѣ Д. Ф. Жилуновичъ, якой і нашы бацькі ня бачылі пры прыгоні“.-.

Быть можетъ они и слегка думали, но просто нехотѣли сознаться даже передъ самими собой, а тамъ, въ какой тѣсной органической зависимости стоитъ Бѣлоруссія отъ многоплеменной цѣлой Россіи, ни въ томъ, что Бѣлоруссія не можетъ вступить на путь независимости и самодержавія по своей сравнительной духовной и моральной бѣдности, въ чемъ наша не вина, а бѣда.

А для того, чтобы была достигнута свобода внутренняя, нужно помнить объ общей великой опасности, которую преодолѣваетъ въ настоящій невѣроятно тяжелый моментъ, оставленная многими демократіями Россіи, нужно помнить о тѣхъ героическихъ мѣрахъ, которыя только и можно осуществить въ общероссійскомъ масштабѣ.

Вмѣстѣ съ тѣмъ эти вождѣленные вожди изъ Рады ухитряются осуществлять эти мѣры совсѣмъ инымъ образомъ, такимъ, что наносятъ существенный ущербъ своему народу и хоронятъ на долгіе годы его дѣйствительное національное самоопредѣленіи. Воспользовавшись моментомъ, господствующимъ въ Россіи, они преступно пошли по линіи наименьшаго сопротивленія и давай прокладывать дорогу къ сомоопредѣленію и „независимости“ черезъ этотъ ущербъ.

Отчего бы не попробовать!?—попытка не пытка, „товарищу“ Скирмунту плохо не будетъ.

И... попробовали...

Но пробой своей сыграли такую роль, за которую предстоитъ народу жестокая расплата.

Попробовали... Попробовали и облекли свою пробу въ такое явленіе для революціонной демократіи, которое способно въ корнѣ погубить революцію и оставить насъ при разбитомъ корытѣ, послѣ всѣхъ пышныхъ надеждъ.

Попробовали... Попробовали и сыграли на руку буржуазіи и людямъ капиталистическаго лагеря, у которыхъ никогда не было какъ движущаго нерва идеи государственнаго цѣлаго, какъ нѣтъ идеи того класса, который видитъ во всемъ лучше будущеее для народа.

Такъ вотъ какую „не незалежность“, а „залежность“ намъ обѣщаетъ „незалежнасць Беларусі“, въ такомъ видѣ, въ какомъ она проводится „отъ имени народа“ группой помѣщиковъ и ихъ ставленниковъ, далеко ушедшихъ даже отъ соціалистовъ-шовинистовъ.

Но вѣдь это можетъ быть нежизненно и не такъ уже страшно, если мы будемъ вѣрить въ силу революціонной демократіи, если мы не будемъ допускать даже мысли о томъ, чтобы вся исторія нашего края и нашей стороны, приведшей къ февральскимъ, а затѣмъ и къ октябрьскимъ днямъ, въ дальнѣйшемъ привела бы къ разрушенію и гибели.

Въ нашихъ думахъ не должно быть сомнѣнія въ томъ, что здоровыя творческія силы спасутъ страну, Великую Совѣтскую Федеративную Республику, спасутъ революцію, спасутъ насъ.

Отбрось, братъ-бѣлоруссъ, мелочныя сплетни и „ужасы“ и „страхи“ сегодняшняго дня, дѣйствуй, какъ это нужно сегодня, избавься отъ психологіи смущенія и сомнѣнія и забудь о тѣхъ ничтожныхъ силахъ, которыя пытаются захватить нашу, народную, власть—они ея не получатъ!

Янка Блудзенскі.

АД РАДАКЦЫІ.

Рукапісы, якія прысылаюцца ля друку, павінны быць чытальна напісаны на адным боку паперы.

Няпрынятыя рукапісы звяртаюцца аутарам, калі ля перасылкі будзя прыслана марка. Малыя рукапісы ня варочаюцца зусім.

РАДАКТАР ПРЫМАЯ ад 11 да 5 г.

Радакцыя і Адміністрацыя: Масква, Паварская, 52, тал. 1-51-63.

Резолюція.

Моряковъ-бѣлоруссовъ всего Балтійскаго флота въ Кронштадтѣ и всѣхъ гражданъ-бѣлоруссовъ, проживающихъ въ городѣ Кронштадтѣ.

(Принята на собраніи Бѣлорусской колоніи 3 іюля 1918 г.).

Заслушавъ докладъ о современномъ положеніи Россіи, и главнымъ образомъ, о родномъ краѣ Бѣлоруссіи, а также сообщеніе о попыткахъ присоединить еще не оккупированную часть Бѣлоруссіи къ ея оккупированной части и тѣмъ самымъ окончательно поработить весь край, собраніе моряковъ-бѣлоруссовъ всего Балтійскаго флота въ Кронштадтѣ и всѣхъ гражданъ-бѣлоруссовъ, проживающихъ въ Кронштадтѣ, признаетъ:

1. Что положеніе всей страны подъ напоромъ Западнаго имперіализма и внутреннихъ осложненій съ каждымъ днемъ становится все хуже и страшнѣе. Теперь уже стало ясно, что въ планы воюющихъ міровъ входятъ преступные замыслы расчлененія Россіи имя которому—черный раздѣлъ Великой Россійской Республики.

2. Что одной изъ несчастныхъ жертвъ этого чернаго международнаго раздѣла Россіи, по своему историческому положенію и современному ходу вещей является наша, долгіе годы спавшая, приниженная и обиженная Бѣлоруссія. Огромная территорія Бѣлоруссіи съ ея естественными богатствами, съ ея, сильнымъ духомъ, бѣлорусскимъ племенемъ, съ ея рубежнымъ положеніемъ и историческимъ прошлымъ,—является выгоднымъ товаромъ на международномъ рынкѣ и этимъ товаромъ стремится воспользоваться въ первую очередь имперіалисчическая Германія.

3. Что захватница Германія въ настоящее время самымъ безчеловѣчнымъ образомъ издѣвается надъ нашимъ роднымъ краемъ въ его оккупированныхъ частяхъ и въ общей шумихѣ готовится дикимъ звѣремъ наброситься и на остальныя еще не занятыя части Бѣлоруссіи, чтобы и въ нихъ собрать все, что можно, вплоть до отобранія послѣдняго зерна, нынѣ богато зрѣющей нивы, а затѣмъ, выжавъ изъ бѣлорусса послѣдніе соки, на всеобщемъ мирномъ конгрессѣ, который уже не за горами, бросить несчастную Бѣлоруссію въ цѣпкія руки одной изъ монархическихъ державъ, услужливо преклоняющихся германскому юнкерству.

Такое положеніе нашего родного края заставляетъ насъ обратиться къ Россійской демократіи и просить,

1) чтобы были приняты самыя рѣшительныя и немедленныя мѣры къ усиленію защиты еще незанятой восточной части Бѣлоруссіи, дабы не дать Германіи богатаго урожая и не подчинить послѣднюю горсть бѣлоруссовъ ея желѣзному террору,

2) чтобы была дана полная возможность и гарантія немедленнаго созыва II-го Всебѣлорусскаго Съѣзда, съ участіемъ всѣхъ живыхъ силъ края, на которомъ самъ бѣлорусскій народъ скажетъ свое рѣшительное слово о дальнѣйшей своей судьбѣ.

Собраніе заявляетъ, что образовавшееся въ Минскѣ самозваннымъ путемъ правительство Рады Бѣлорусской Народной Республики оно не признаетъ и противъ его шаговъ въ плоскости разрѣшенія общихъ бѣлорусскихъ дѣлъ энергично протестуетъ.

Собраніе считаетъ, что вся Бѣлоруссія, по духу своего бѣлорусскаго трудового народа, по своему историческому прошлому и по ходу Великой Россійской Революціи — является неотъемлемой частью Россійской Федеративной Республики, въ которую она должна войти, какъ автономное государственное цѣлое.

Собраніе заявляетъ, что въ цѣляхъ защиты Бѣлоруссіи и ея естественнаго самоопредѣленія, въ цѣляхъ созданія общероссійскаго Федеративнаго Союза, оно готово отдать себя въ распоряженіе тѣхъ организующихъ круговъ, которые возьмутъ на себя защиту возраждающейся и естественнымъ путемъ самоопредѣляющейся Родной Вольной Бѣлоруссіи.

Собраніе протестуетъ также противъ общаго стремленія Германіи навязывать трудовымъ народамъ оккупированныхъ его частей Россіи монархическій и буржуазный режимъ, отбрасывающій культуру народовъ и ихъ раскрѣпощеніе на цѣлыя столѣтія назадъ.

Предсѣдатель собранія: **Г. Мельниченко.**
Секретарь: **Карповъ.**

Краю.

Ой, бедны мой краю,
Як сэрцэ знывая,
Што зноу ты у няволю папау,
Што зноу ужо сяляня
Працуюць у прыгнаньню
Здзірайцау ліхіх багачоу.
Заглянула сонца
На крыху у ваконца,
Да мусі ня урочаны час,
Бо чорная хмара,
Як цяшкая кара
Засмуціла ясная ураз.
Ня усьпеушы ачнуцца,
Вакол азірнуцца,
Убачыушы волю мой брат;
Як некая сіла
Ізноу прыхіліла
З вялікаю мукай, бы кат.
Гэй, устань, зварушыся,
За дзела вазьміся,
Не здайся у няволю паноу.
Ты, знаеш даволі
Аб цяшкуй няволі,
У якой перажыу шмат вакоу.
Сучась жа надзею
Што зможаш зладзея,
Нябудь селянін церпялівы.
За другую здзеку,
С'прад самаго веку
Сумей адамсціць—як мажліва...

Янка Чарнушэвіч.

Задачы бежанцау-беларусау.

С самаго пачатку свайго з'явішча бежанская справа у Расеі была няналаджана: гасударскае помачы было мала і размяркоувалася яна паміж бежанцамі розных нацыянальнасцяу надта няроуна, прыпадкова і самым дрэнным манерам: праз розныя дапамогчыя арганізацыі і камітэты. Гэты камітэты, як вядома, скадваліся сяк-так, трапункова і у іх пападалі боляй усякаго толку паны ды багачы, якіе за мест помачы працоунаму народу, сапрауды пацярпеушаму, адпушчаныя грошы разсовалі сабе па кішэнях і нажывалі скарбы. Бежанцы ж цярпелі усякія нядастаткі, голад і холад.

Яшчэ сярод бежанцау палякоу, літоуцау, латышоу і жыдоу—справа дапамогі была хоць трошкі ды пад наглядам самых бежанцау і растратак ды кражы грошы іхнімі бежанскімі арганізацыямі ня так былі заметны.

Гэты народы боляй пракідкія, ляпей з'арганізаваныя, што і памагала ім трымацца стойка, і што давала магчымасць і сілу, калі тоя патрабавалася, загаварыць перад камітэтамі і усякімі бежанскімі арганізацыямі боляй-меняй смелым тонам і справу направіць. Зусім ня тое мы бачым у справя дапамогі бежанцам беларусам. Налічваючы боляй, ніж іншыя нацыянальнасці лік бежанцау, беларусы праз сваю цемрывасць і нацыянальную няасведамленасць цярпелі боляй усіх. Праз увесь час вайны яны тоя й рабілі, што швендаліся з аднаго мейсца у другое, нідзе ня дастаючы спагатды. Справа у тым, што царская правіцяльства лічыла беларусау за расейцау і грошы, як нацыянальнасць, ня адпускала.

У свой чарод, ніякіх знарочыста расейскіх установ ля дачы падмогі беларусам-бежанцам яно ня рабіла, весь і выходзіла, што беларусы-бежанцы цогля заставаліся самымі няшчаснымі, як пасынкамі. Працы ж ля самапомачы па той самуй нацыянальнуй раз'еднасці яны ніякае ня рабілі і праз гэтая іх няшчасця углыбвалася яшчэ боляй. Змерласць і хваробнасць між беларусамі-бежанцамі стаялі вышэй, ніж між бежанцамі іншых нацыянальнасцяу.

Прауда, ля помачы беларускім бежанцам' пазней усіх, былі заложаны сякія-такія арганізацыі, але помач іх была ужо на ліха казана.

Адно з гэтых установ, Гродняпскі абывацяльскі камітэт, і мог бы што-кольвяк зрабіць, каб гэта іон быу зложан з самых селян-бежанцау і іншых шчырых людзей, але у ём заселі усякія ашуканцы і прахадзімцы, паны і грашаунікі, якія усю справу помачы зводзілі да таго, што усе адпушчаныя ім грошы ля бежанцау—дзялілі між сабою цэлымі дзісяткамі тысяч, нібы у адплату сабе за зруйнуваныя меньня. Другія ж—чыста беларускія, гэта: „Беларуская обчаства помачы пацярпеушым ад вайны, працуючыя крыху у Вільні, а то у Пецярбурху і Мінску, на смех мала даставалі грошы, і працы у шырокуй хвормя ніяк ня магло у іх наладзіцца. Гэтак, пецярбурскаму Беларускаму обчаству за увесь час далі усяго на усяго 45 тыс. рубліоу. У той час, калі літоускія і польскія даставалі сотнямі тысячау.

Так цягнулася да апошніх часоу. Царская правіцяльства—равалюцыя замяніла каляцыйным, а каляцыйная—работнічаселянскім—а тым часам справа помачы бежанцам-беларусам стаяла на адным мейсцу.

І усе з-за таго, што у дзеля арганізацыі яны адставалі ад усіх, лічучы вярнейшым маучаць спакойна, сядзець нярухома і чакаць. Але час мінау, а помач, якая патрэбна была, ня прыходзіла і трэ было толькі свардзіцца ды жаліцца...

Каліж звернамся да сучаснаго, та як і уперад, беларусы-бежанцы і цяпер скрозь нальны глядзяць на усякую арганізацыю паміж сабе, і на гэты раз, відаць, лічучы, што ужо яна ня патрэбна. Бядома—гэта, так сама вялікая абмылка і абмылка дужа шкодная. Як відаць, палітычная палажэньня покуль што да таго ня ясна, да таго запутана, што чакаць у скорум чася агульнаго вертаньня дамоу німа чаго. Яшчэ шмат—пройдзя часу, покуль з гэстым усе наладзіцца і гэты час марнаваць—нельга і грэшна. Мне магуць сказаць, што усяроуно цяпер пайкі адменяны і ніякае помачы нядаецца дык на вошта тыя клапоты па арганізацыі. Але я на гэта адкажу, што так ды ня так. Помач усе-такі селянска-работнічым правіцяльствам даецца і даецца па неньш, калі ня больш, як і уперад, хоць і у другой хвормя, ніш пайкі. Але гэтая помач можа ня дастацца тым бежанцам, якія нядбаюць самі нічога і астаюцца асабіста і уразбіуку, кожны па сабе. Гэткім парадкам ніколі нічога зрабіць няудаецца і няудасца.

Апроч таго, што хаурусы і камітэты, у якіх павінны лучыцца беларусы бежанцы па усіх кутках, маглі б боляй дастаць помачы і лепяй ужыць яе, яны б яшчэ шмат дапамаглі б і на прыпадак пераездкі дамоу.

Ня трэба забываць таго, што пяраезд, ці равакуацыя, як то празываюць, рэч ня гэткая простая, як здаецца з боку гаворучы. Па праудзя, гэта адна ад труднейшых спрау.

Вертацца абы як, як папала ня будзя можна, каб ня рабіць вялікае блутаніны і забіукі чугунак; а так сама, ня аказацца бяз усякае падмогі на дарогу, на яду і на лекі. Равакуацыя павінна быць наладжана па пляну і мець парадак.

Вось гэты плян і парадак і мусяць лепі выпауняцца камітэтамі. На прыклад, калі бежаняц-беларус, скажам, з Саратава захоча вертацца к сабе да дому, та іон ня сядзя, ды ня паедзя проста на Воршу і усе, а мусіць яшчэ праведаць калі яго пусцяць, дастаць правы на праезд, ды пастарацца атрымаць дармяную дарогу, ці іншую падмогу.

Задумаушы, у вяусякі час, гэтаго зрабіць нельга. Каліж у Саратавя будзя камітэт, ці якая другая бежанская беларуская арганізацыя, тады ён можа звярнуцца да яе і усе разузнаць дастаць і праведаць. Бо у гэтум камітэцэі, ці іншай арганізацыі, будзя усе вядома: калі можна ехаць, у якоя мейсца кудэю і як ехаць; камітэт, ці іншая арганізацыя будзя старацца заусягды абараняць інтарэсы беларусау бежанцау, каб яны ня заставаліся ззаду другіх, каб справа атпраукі была наладжана як мае быць; каб дзе трэба і дзе трэба мець дактарскую помач і страуні ды многія іншыя.

Адным словам—карысць ля бежанцау гэты камітэты могуць зрабіць нязлічана і бяз іх, усяроуно, як бяз рук. Каб яны былі зразу сярод беларусау наладжаны, та коб ня давялося б ім працярпець столькі лішняго гора і бяды. Ня прыходзілася б чытаць у газэтах і такіх вестак, што цяпер у Воршы, дзе сабралася некулькі дзісяткау тысяч бежанцау, беларусы бежанцы мучацца горай усіх... У другіх нацыянальнасцяу у апошні час

ФЭЛЬЯТОН.

Песьня.

Як с-пад лесу, с-пад гары
Йшлі грамадкай маляры;
Ой, люлі, ой люлі
Грамадою хутка йшлі.

Тауставатыя, як мэндлі
За плячыма няслі пэндлі.
Ой, люлі, ой, люлі
За плячыма усе няслі.

У іх руках былі вядзера,
А у вядзерах мулі мора —
Ой лі, люлі ой,
Мулі чорнае густой.

Іх старэнна хутка веу
Правадыр якісь с папоу.
Ой люлі, ой люлі —
Яны слухалі ды йшлі.

Ні з цаной ці бяз цаны,
А згадзіліся яны.
Ой, люлі, ой люлі
Бо кірунак ім далі,

У кароткі скоры час
Схварбаваць на шчэнт ікрас,
Ой, люлі, люлі ой
Чорнай хварбаю густой;

З бору цемнаго пад гай
Весь вялікі бедны край.
Ой, люлі, ой, люлі
Беларускае зямлі.

Хварбу „Белая“ скрозь змыць
Каб вачэй ня раздражніць.
Ой, люлі, ой люлі!
І старэньнянка зьнялі...

Так грамадай з за гары
Прышлі тыя маляры.
Ой люлі, ой люлі,
Няпрашоныя прышлі.

І узяушыся за дзела
Зьнялі назву „Русі Белай“,
Шчыра емка і правόрна.
А надзелі—„Русі чорнай“
Ой, люли, ой люді
Хварбай чорнай падвялі.

І заместа Беларусь.
Край стау проста Чорнарусь.
Ой люлі, ой люлі,
То—прадаунікі былі.

Авадзіон.

справа арганізацы бежанцау і помачы ім пасунулася многа у перад: вось і нядзіва, што яны шмат збаулялі ад лішніх пакут. Адны беларусы як усюды, і цяпер застаюцца з-заду. Дык кіньця ж нядбайнасць і хоцькі трошкі пакланацецяся самі аб сваёй долі, беларусы бежанцы, калі хочаця, каб яна ня была у вас горшай ад другіх. Час ня жджэ!

З. Ж.

Пазнаньня Беларусі.

Поміж с тымі цудоуными згаворамі, якія вядуцца між нямецкім правіцяльствам і беларускай радай наконт „Незалежнасці Беларусі“, гэтыя самыя немцы старэнна узяліся пазнаваць Беларусь, тую, якая яна была і ёсць з усіх бакоу. З гэтай мэтаю, хітрыя і пракідкія, яны гостра зацікавіліся перш усяго старымі помнікамі беларускай культуры і праз сваіх вучоных, д-ра Энкву і інш. У цяперашні час стараюцца адшукваць іх і сцягаць у Вільню на выставу.

Следам нямецкія друкарні старэнна гатовяць плодна і спорна пішучыя рознымі нямецкімі „вучонымі“ усялякія кніжкі аб Беларусі, як апавядальныя, так і навуковыя: гістарычныя ды этнаграфічныя; малярныя выданьня альбомы, асобна мапы і інш.

Цэлым морам разліваюць яны гэты свае вырабы па усей Беларусі. У Мінску, Вільні і іншых гарадах імі паадчыняты кнігарні, дзе усе вокна застауляны гэтымі кніжкамі і завешаны мапамі-

На апошніх дык у яскра выразнуй мулі ахварбован абшар Беларусі, якой яны, вядома, хутка дадуць „незалежнасць“. Між іншымі кніжкамі выдзяляецца дужа выпукла „сямімоуны слоунік“ ля скораго азнамленьня немцау з мейсцовымі мовамі, між якімі на першуй пляна стаіць беларуская мова. Рэкляма аб гэным слоуніку запруджвая усе газэты і нават шмат яе сярод абвестак беларускіх газэт. Але вянцом усяго, што далі „шчэдрыя“ немцы покуль што Беларусі — гэта — надзівуй—цяя! — беларускую граматыку, якую, як перадаюць напісау адзін прахвэсар, да таго зусім незнаушы навэт беларускай гаворкі. Адным словам—пазнаньня немцамі нашае краіны ідзе на усім пару! Беларускія незалежнікі з хеуры. Скірмунта і іншых пянарадуюцца з гэтаго, цешучыся, што іх (па іхняму) краіну гэтак старэнна апісвая абмулявывая ды змервая іх „шчыры збавіцяль і суседдобры немяц“. Тым часам, хітры і пранозаваты нямецкі ваяуніч буржуй толькі рада глытая слінку і цешыцца праглядам у тоя, што можа іон выцарпаць з прадапае яму краіны. Апошнія часы акупацыі ня здарма прайшлі ля іх: на усю магу яны стараліся усе аблегдзяць і абмерацьпа Беларусі і тоя, што яны выглядзялі, ня дае спакойна ім спаць. Беларусь—гэта дужа багаты хлебам, лясамі, торфам і інш. дабром край. Яна ніколі няпатрабавала хлеба, а заусюды вывозіла яго, лясы, якіх ня змаглі знішчыць, стараючыся ля гэтаго весь час, немцы — нязцапены, а тыя залежы торфы ды добрай гліны—нямаюць меры. Апроч так званых ясцесцвяных (натуровых) багацьцяу, Беларусь мая шмат чугунак і розных хвабрык ды заводау, якія давалі шкур і матэрі на опратку не адной Беларусі. Усе гэта—і есць тая нітачка, якая вымушая нямецкую ваяупічую буржуазею гуторыць з Сакратарыятам Беларускай Распублікі і даваць яму тыя ці іншыя абецанкі па „нязалежнасць“. Вядома, што гэткую „нязалежпасць“ немцы і дадуць, але няпалягчая ад яе нікому.

Канешня, да часу беларускуй буржуазеі спадзе крох, але даляй гэты крохі вылязуць ей омегам. Нялічучыся адпак с тым, япа прадае Беларусь у цаплючыя лапы нямецкаго абіраньня і руйнуваньня за... незалежпасць.

Прадае і стараяцца падкрэсліць спагаду і чуткія адносіны культурпаго народу да Беларусі. Вось як дзеюцца справы і вось у чым той сэнс усякіх незалежпасцяу з хвабрыкі нямецкай буржуазеі. Ведай працоуны беларускі народ і старайся з усей магі ня дапусціць да гэтаго — каб ня памерці...

Змітро Жылуновіч.

Взглядъ бѣлорусскаго національнаго комиссаріата на задачи и дѣятельность Народнаго комиссаріата по національнымъ дѣламъ.

Узко-націоналистическая политика правительства до мартовскаго переворота 1917 года имѣла очень тяжелыя послѣдствія для окраинъ бывшей Россійской Имперіи. Продолжающіяся еще до сихъ поръ на окраинахъ сепаратистскія стремленія нѣкоторыхъ элементовъ, даже не буржуазнаго склада мысли и убѣжденій, являются печальнымъ послѣдствіемъ царскаго режима. Старый строй, не будучи въ состояніи высоко держать свой авторитетъ силою культурнаго и интеллектуальнаго вліянія, примѣнялъ въ своей централистской политикѣ самые грубые и грязные способы для подавленія проявленій иного національзма, кромѣ истинно-русскаго. Поощряемая и вдохновляемая правительствомъ, болѣе правая, чѣмъ само правительство, партія Пуришкевича и Маркова II, субсидируемая изъ казны, разбивала свои союзы по всѣмъ угламъ Россіи; особенно обильно испещренъ ими былъ Западный и Юго-Западный край. Вильна, Минскъ, Варшава, Кіевъ, Кишиневъ, Одесса—вотъ главные пункты дѣятельности черной сотни. Выборы этихъ пунктовъ не случаенъ. Сюда были двинуты отряды явной и тайной черной арміи, здѣсь они занимались провокаціей, возстанавливая одну націю противъ другой, видя въ этомъ римское „раздѣляй и властвуй“. Эта травля, вѣчное заподазриваніе, запугиваніе, подавленіе всякой попытки къ проявленію національной самобытности привели къ тому, что даже „благомыслящіе“ мѣстные элементы стали относиться съ непріязнью и къ тогдашнему правительству и ко всему русскому. Непріязнь этой широкой волной разлилась въ послѣдніе годы царскаго режима по всѣмъ украинамъ и охватила всѣ слои мѣстнаго общества.

Всѣмъ помнится такъ называемое украинское движеніе 1911-1914 годовъ, когда правительствующая царская печать заговорила объ опасности мазепинства. Въ той или иной мѣрѣ аналогичныя движенія были и въ другихъ окраинныхъ областяхъ. Эти движенія зажигали духъ шовинизма, толкали искать поддержки у сосѣднихъ государствъ, создавали всякаго рода „оріентаціи“—австрійскую, германскую, шведскую (для Финляндіи).

Съ такимъ, между прочимъ, настроеніемъ подошли руcскія окраины къ мартовской революціи, которая, казалось, должна была разрѣшить въ числѣ другихъ и вопросы о правахъ національныхъ меньшинствъ. Первыя недѣли послѣ переворота прошли въ яркихъ надеждахъ на широкую автономію окраинныхъ народностей, изъ которыхъ каждая съ трепетомъ восторга ждала свободной работы въ своемъ краю, радостно мучилась вопросами, какъ лучше создать свою національную жизнь. Но скоро эти надежды стали блекнуть. Временныя Правительства всѣхъ составовъ и окрасокъ, вплоть до октябрьскаго переворота, въ отношеніи окраинъ стояли на той же точкѣ централизаціи и имперіализма, какъ и правительство стараго режима. Былая непріязнь стала снова воскресать въ видѣ недовѣрія къ Центральному Правительству.

Этимъ-то недовѣріемъ и недовольствомъ воспользовались контръ-революціонеры въ моментъ октябрьской революціи. Они, потерявъ всякую надежду спасти свое положеніе въ центрѣ Россіи, устремили свои взоры на тѣ окраины, гдѣ меньше всего можно было спасаться отъ сопротивленія революціонной арміи и гдѣ можно было выиграть на сепаратистскихъ и націоналистическихъ стремленіяхъ. По этому Украина, Донъ, Кавказъ, Сибирь сдѣлались мѣстами ихъ убѣжища и арены дѣйствій. Вся правая печать съ удовлетвореніемъ писала о намѣчающихся „здоровыхъ“ національныхъ единицахъ, которыя послужатъ базисомъ для „исцѣленія Россіи отъ „большевистской заразы“.

Но трудовой народъ окраинъ не оправдалъ тѣхъ надеждъ, которыя возлагали на него вожди контръ-революціи. Съ момента октябрьскаго переворота и укрѣпленія Рабоче-Крестьянскаго Правительства произошелъ переломъ воззрѣній въ оріентаціи пролетаріата и крестьянства окраинъ, которые увидѣли въ существованіи Совѣтской власти осуществленіе всѣхъ своихъ завѣтныхъ чаяній. Это направило ихъ итти однимъ путемъ съ рускимъ трудовымъ народомъ въ окончательномъ достиженіи и осуществленіи идей соціализма. Трудовой народъ на окраинахъ повелъ рѣшительную, побѣдную борьбу съ контръ-революціонными элементами, отказавшись отъ тѣхъ сепаратистическихъ стремленій, какія возбуждали въ немъ его враги со времени октябрьской соціалистической революціи. Но этотъ переворотъ произошелъ поздно. Контръ-революціонерамъ удалось договориться и продать трудовой народъ въ руки нѣмецкаго имперіализма. Эта продажа, при поддержкѣ нѣмецкихъ пушекъ и штыковъ, происходитъ и теперь въ

М. Капыль у Равалюцыі.

(Працяг. Глядзі № 17)

Але ужо падходзіу гэткі настрой, што нядбалася ні аб чым. У грабарскіх майстэрнях нябоязна пеялі равалюцыйныя песьні, хадзілі збіраць ахвяры на арганізацыю. Праўда, усе-такі як раз у адчыняную баяліся ісці, хоць боляй гэта рабілі ля спехі бацькоу, каб тыя у прыпадку чаго ня гаравалі аб сынох... Трэба ня забыць адмеціць, што у гэты год, праносшыя на Расеі жыдоускія пагромы, паставілі дужа гостра пытаньня аб арганізацыі самаабароны. Клапаціла гэта больш жыдоускія арганізацыі, Бундаускую і Сіяніцкую, якая к гэтаму часу змагла згуртавацца з някоторых боляй багатых і інталігэнтных станау; сацыялдамакраты стараліся памагчы гэтаму. Былі у школах таемна, пошля маленьня зробляны парады сярод жыдоу-мяшчан і пушчан кліч сабраць грошы на варужжо. Скора было сабрана каля тысячы рублёу, выбран камітэт ля гуртаваньня баявоя дружына і ля яе варужэньня. За варужжам былі разасланы людзі у Мінск, Бабрусак і др. гарады.

Бачучы, і чуючы сваімі вачыма і вушамі, капыльскі станавы Вабішчэвіч прозвішчам, падбухтораны вураднікам, Рагачом, чалавекам дужа хітрым і пракідкім, пачау прасіць на мілы Бог вышэйшыя уласці, каб прыслалі у Капыль салдат.

Німа ведама, ці іх нястарчыла, ці якія іншыя мяшалі таму прычыны, толькі час ішоу, а Капыль аставауся бяз салдат. Падканец, зробляная у 1905 годзя 1 марца першая у Капылі вялізорная дэманстрацыя, аб якой паціcалі у Мінскіх газэтах, параспыла справу аб прысылацца салдат хутка і верна...

Некулькі слоу аб дэманстрацыі. Першаго марца якрас выпала на першы ці на другі тыдзянь у посця і да яго сталі гатовіцца з самае масляніцы. А трэба сказаць, што малыя пробы маніхвестацыяу зусім прыпадкова пачалі спробуваць с пачатку новаго году: гэтак, на Коляды і пошля некулькі разоу, збіраліся вячарамі дзісяткау два—тры хлопцау і з равалюцыйнымі песьнямі прайходзілі між хаты вурадніка, а потым і разыходзіліся.

Пошля кожнае гэткае пробы настрой падніmауся і з‘яулялася хаценьня зрабіць штосьці стройная, вялікая і значная. Вось і было парашано зрабіць дэманстрацыю першаго марца. Гэты дзень быу выбран таму, што у справе равалюцыйнаго руку іон меу сваю значнасць: як ведама у гэты дзень якрас быу забіт у 1881 г. цар, Алесь II. Апроч таго яшчэ і у другіх местох, як Слуцак, м-ка Клецак і другія, так сама парашано было зрабіць маніхвестацыі.

Вось за некулькі дзіон да першаго марца быу да дробак абгаворан плян і зроблян чырвоны штандар. Абгавор хавауся у таемнасці і рэдкія сябры арганізацыі гэта знали, ня толькі хто з пастаронніх. Праўда, ужо у назначаны дзень, аднак, чуткі аб дэманстрацыі нейкім манерам былі агалашаны па усім мястэчку і усе, як у бубян білі, толькі і гуторылі аб нячуванум да таго з‘явішчу. Настрой жыхароу дужа быу цікавян тым, што бадай ня усе мястэчка верыла, што так ці інакай, а гэта знак ня дужа добры. Есць вядома, што капыльская начальства так сама было, як кажуць па расейску, „у курсѣ дѣла“ япо да таго лічыла сябе безмоцным (што і было на праўдзя), ажно баяліся, як станавы, так і вураднік, на вуліцы паказацца; навэт, здаецца і ня начавалі у сваіх кватэрах... Аб тых ці іншых прашкодах памяшаць дэманстрацыі — яны і думаць ня маглі...

Дарога, як мусяла ісці працэсся, я ужо упамінау, была выраблянa зараняй, так сама зараняй было памечана і мейсца зборышча дэманстрантау, — гэта агарод за мястэчкам, з боку Клецкае дарогі... К гадзінам дзевяці вечара пазначана было зборышча і зараз жа мусяла крануцца... Трэба павядаміць, што хоць апаскі за свой ліос у той час ніхто з дэманстрантау нямеу, але усе ткі спосаб прадасцярогі быу прынят і многія з дэманстрантау, боляй віднейшыя кіраунікі арганізацыяу паадзеты былі ня у сваю опратку, каб іх ня так ліогка было кажнаму прыкмеціць. Другая мера была тоя, што староніх стараліся ня дапусціць блізка да шарэнгі дэманстрантау, дзеля чаго загадчыкі весь час за гэтым сачылі...

А дзісятуй гадзіня сабралася шмат людзей, чалавек да трох сотак, дзяучат і хлопцау. Усе яны былі пастауляны у рады, пабраушыся за рукі такім манерам, што уперадзя былі боляй смелыя і адважныя з варужжам (мелася каля пятнанцаці ляворвярау), у сярэдзіня былі дзяучаты, а з-заду так сама хлопцы. Штандар уручан быу таварышам з сярэдняго раду папярэдняй шарэнгі. На бакох, спераду, у сярэдзін‘я і з-заду пасталі кіраунікі. І вось, па камандзя усе крануліся, зацягнуушы Варшаўянку. Пры словах „Знамя борьбы гарда падымям“ было паднята вялікая пекная знамя, на якім было намалевана дзьве вітаючыя рукі і напіс: Пролетаріи всѣхъ стран-соединяйтесь! Гэты момэнт — проста ня забыуны у гісторыі равалюцыйнаго руху у Капылі!

На малюйця сабе нявялічкая, глухоя мястэчка глухой Міншчыны. Перапясецяся уражэньням па яго вуліцы. І вось, цеплая мартауская ноч, цемная, як цалун! Тысячная грамада мешчан, жыушая успамінамі аб прыгоня і весь час ачуваючая на сабе прыхожасць царскіх сіберных парадкау, з падаткамі, з налогамі, з грабствам іх кроу‘ю нажытаго дабра за нязможнасць аплаціць іх... гэта тысячная грамада, якая векавым прыгонам бачыла адзін цяжкі уcціск палашоу і яскрава па казкам старажылау помніушая нядаунюю крывавую гістор‘ю барацьбы за адбіраную у іх землю, што яна, гэта грамада магла ачуваць у той момант, калі дзеці многіх з іх, захопляныя паветрам свабоднаго духу, пусціліся у адчыняную барацьбу з начальствам!

І іх закінутым у глуш мястэчку, бяз якога і абысціся было б ня грэх далекім гарадом, і найболяй усёй Расеі, і на табе: гэткая дзіуная з‘явішча, як дэманстрацыя! Розум іх ня мог ахапіць гэтаго! Ня убірала галава думак! Канешпа, былі і тыя, што трымаліся іншых думак, бач разумнейшыя, найболяй з жыдоу, толькі іх было мала, ды бадай не палежачых да арганізацыі можна было пералічыць на пальцы.

Дэманстрацыя рухала ціха, паважна! У паветры, над галавамі, лунау штандар. Пявуча і толасна няслісся напевы адной за другою равалюцыйных песянь. Калі паглядзець было з вышы, та на добрую вярсту была запружана дарога народам. Як па Ярдані людзей! Казалі аб гэтуй дэманстрацыі цошля.

(Будзя даляй)

Стары С. Д.

Бѣлоруссіи, Литвѣ, Финляндіи и др. бывшихъ окраинахъ Россіи.

Изъ этого краткаго очерка взаимоотношеній національныхъ меньшинствъ къ Россіи вырисовываются тѣ задачи, которыя долженъ поставить себѣ Народный Комиссаріатъ по Національнымъ дѣламъ и выполненіе которыхъ доставитъ побѣду трудовому народу.

Одна изъ этихъ задачъ—охранять каждую изъ національностей отъ покушеній съ какой-бы то ни было страны на принципъ, провозглашенный и осуществленный актябрьской революціей, самоопредѣленія народовъ. Если этотъ принцыпъ будетъ проводиться неуклонно, то безъ сомнѣнія всѣ народности войдутъ въ братскій союзъ съ русскимъ народомъ, съ которымъ они осуществлятъ всѣ завоеванія рабоче-крестьянской революціи. Сохраненіе этихъ завоеваній важнѣе для пролетаріата и крестьянства всѣхъ посуловъ о независимости, которыми пытаются затемнить ихъ сознаніе. Второй задачей является возможное оказаніе матеріальной и духовной поддержки той массѣ бѣженцевъ, которая наводняетъ теперь Россію и находится, въ большинствѣ случаевъ, въ бѣдственномъ положеніи.

Если Народный Комиссаріатъ по Національнымъ Дѣламъ будетъ всемѣрно стремиться къ разрѣшенію этихъ задачъ, будетъ стоять на стражѣ защиты правъ трудового народа различныхъ національностей, то отторженіе этихъ областей отъ Россіи будетъ лишь временнымъ, и онѣ, освободившись отъ захвата и насилія, войдутъ въ союзъ народовъ Россійской Федеративной Республики Совѣтовъ.

Весьняныя думкі.

Ужо і летачка сьвятоя
Трэба зараз сустракаць—
Жыта у полі ня благоя
Пачынае русаваць.
Зерня хутка, у дзьве нядзелькі
Забрыняя у каласкох
Й на пакося свежум велькі
Закрасуя сена стог.
Кінеш вокам па вакругу—
І сцешая душу усе;
Збожа уродла, рунь на лугу!
Колькі шчасця нам нясе!
Толькі ж у голау лезя смутка
Ды у грудзях спіць нуда...
Што, відаць, яшчэ ня хутка
Родны край міне беда!..

Юзік Тросько

РЕЗОЛЮЦІЯ

о партійной дисциплинѣ, принятая общимъ собраніемъ секціи бѣлоруссовъ-большевиковъ.

Общее собраніе секціи бѣлоруссовъ Росс. Комм. Партіи (большевиковъ), заслушавъ докладъ тов. Лагуна, и учитывая нястоящій моментъ, требуетъ отъ своихъ членовъ строгаго подчиненія партійной дисциплинѣ и постановляетъ:

Немедленно составить именной списокъ секціи бѣлоруссовъ Петергофскаго Района Россійской Коммунистической Партіи (большевиковъ). Составленіе списка поручается тов. Ковшило; на всѣхъ собраніяхъ провѣрять присутствующихъ по списку и, въ случаѣ одной неявки члена, потребовать объясненія причины, а **въ случаѣ 3-хъ неявокъ исключить изъ секціи и партіи, при чемъ каждое исключеніе опубликовать въ газетѣ**, а также извѣщать объ исключеніи изъ партіи для служащаго гдѣ-либо, если служба имъ была получена только потому, что данное лицо состоитъ въ партіи (т. е. было рекомендовано партіей), то просимъ его уволить. Вмѣнить всѣмъ въ обязанность обучаться военному искуству безъ всякихъ уклоненій.

Председатель **Устиловичъ**. Секретарь Ковшило.

У забрануй Беларусі.

Па весткам, атрыманым ад асобау нядауна прыехаушых з Міншчыны, палажэньня селян с кожным дніом робіцца усіо горшым. Нямецкія вайскі абіраюць селян, як мага. Так, у адной воласці Барысаускаго павету немцы спачатку затрэбавалі 17 пудоу мяса у тыдзянь, потым перайшлі на 30, даляй—75, а у апошнія часы дайшло да 150 пуд. Селяне згаджаліся карміць усіх немцау, што знайходзяцца у вакрузя воласці, але нямецкія уласьці ня згодны з гэтым і трэбуюць столькі, як ім мніцца па уласным рахункам. Як было заказана даваць ад воласці 150 пуд. мяса, та селяня адказалі, што яны па добруй волі ня дадуць: нехай немцы бяруць сілаю, калі хочуць.

Цяпер, як пачынае падыходзіць пара касьбы і жнітва, немцы паатбіралі у селян сярпы і косы, дакляруючы прыслаць свае машыны дзеля уборкі хлеба і сена. У гэтым селяня бачаць жаданьня немцау забраць сабе увесь ураджай. Ураджай жа у гэтым годзя натта добры, і часткаю праз тоя селяня крэпка засмучаны, што такоя дабро пападзе у чужыя рукі. У някаторых мейсцох забранае Магіліоушчыны нямецкія салдаты выкошваюць дзеля корму коням маладое збожжа. Плачуць селяня, глядзючы на такую псоту іхняе працы і надзеі.

Аб правіцяльстве Беларускай Народнай Распублікі селяня нічога ня ведаюць—іосць яно ці німа. Селяня ва усім сустракаюцца толькі—уперад с палякамі, а цяпер з немцамі. Іншае уласьці яны ня бачылі. Калі я запытауся у селяніна, з якім меу гутарку, чаму яны ня скардзяцца на уціск немцау свайму правіцяльству у Мінску, дык іон адказау:

— Ховай Божа! Скардзіцца на немца, калі іон усім гарудуя. Ды каму скардзіцца? Хіба самым немцам, бо іншае уласьці німашака.

Альфа.

Паводлуг думкі аднаго выдатнага беларускага палітычнага дзеяча, у Менску будзя адкрыта асобная школа — Беларуская Грамадзка-Навуковая Кольлегія, каторая мая на мэці прыгатаваць дазнаных і сьвядомых у беларускіх справах працаунікоу дзеля кіраваньня ладжанымі беларускімі грамадзкімі і адміныстрацыйнымі установамі. Поуны курс будзе трываць 2 месяцы. На першы курс будуць прынімацца асобы (бяз рожніцы пола), якія скончылі прынашсі ъ кламау б. расейскіх сярэдкіх школ. Плата за навуку за увесь курс — 200 рублеу. Навука будзе адбывацца павэдлуг спэцыальнай сыстэмы (гутаркі і рэпэтыцыі). Прайшоушым курс навукі с пазваленьня Народнага Сэкрэтарыату будуць даваць атэстаты, каторые даваціМУЦЬ некаторые правы і прывілеі пры паступленьні на службу у урадавых установах Рэспублікі.

Адкрытые павэдлуг думкі беларускай падкамісіі дзеля народнай прасьветы пры Менскай сталічнай Думе Курсы Беларусазнауства (Захарауская вул. 43), развіваюцца вельмі удачна. На курсы запісалася ахвотнікау шмат больш, чым можна було спадзевацца. У чысле лектароу — выдатпые беларускіе палітычные і культурные дзеячы, як А. Смоліч (народны сэкрэтар асьветы), Я. Варонка (старшыня Народнага Сэкрэтарыату) Я. Лесік (рэдактар газэты „Вольная Беларусь“), прэфэсар Масоніус, Ст. Ленкоускі, Кодіс, Косьцевіч, Аусянік ды іншые. Слухачы — самые рознародные: тут і людзі ужо паджылые з унівэрсытэцкімі значкамі, і малаграматные дзяцюкі, і студэнты б. расейскіх вышэйшых школ, і гімназісты, і т. д. Павэдлуг нацыянальнасці пераважываюць беларусы, а за імі ідуць па парадку: жыды, вялікарусы, палякі і украінцы.

Перадаюць, прыехаушых с старой акупацыі людзі, што сёлета там дужа [illegible] ураджай, якога ужо доуга ня было. Жыта бы лес, яравыя так сама. Жыцьціо у Вільні імі мулюяцца вось у якіх хварбах: г. Вільня, бы мертвая: німа ніякаго гандлю, стаяць хвабрыкі. Няхапая ніапраткі, ні абуткі. Чаравікі каштуюць 200 марак, гадзянькі паркаль 5 руб. локаць. Яды за тоя досі: хлеб 60 кап. хвунт па вольнай прадажы. Па карткам, даюць ½ хвунта на душу і плацяць за хвунт два злоты. Малако, масла і мяса—так сама дзешава. Як бачыць—жыць ня кепска, але адна беда, німа у людзей нізваньня грошы і гэта дзяшавізна вылазіць омегам.

Настрой жыхароу баявы: усе толькі і чакаюць момэнту, калі б з Расеі даліб падмогу. Тадыб немцам няздабраваць. Ато пад нямецкім усціскам нічога ня міла. Да і усе дабро забіраяцца немцамі.

Аб усім па троху.

Пецярбускім хаурусам металістау (работнікі, што працуюць на тых заводах, на якіх вырабляюць усе з металау: жалеза, медзі, чугуну, ды іншая) сабраты лічбы аб граматнасці яго сябрукоу. З 10,106 чалавек граматных выявілася 8,942, няграматных 1,254. Як мужчын так і кабет граматных 88%. Шкода, што матэр'ял ля разробкі гэтаго пытаньня датыркнууся толькі 12.000 рагастрацыйных (апытных) картак. Процант граматлых, як кабет, гэтак мужчын сярод ткачоу у Пецярбурху, згодна данным хауруса гэтых работнікау, шмат меньшы і дацягвая усяго толькі 50%.

Забастоука у Аустры і Венгры ахапіла увесь край.

Забастовачны рух пачауся і у Гішпані. У лёхах (копях) Непарожна натрабаваньня забастоушчыкау ня выпоунена. З-за гэтага палажэньня дужа стала сур'езным.

У Мінску немцы эабіраюць расейскія грошы. Надоячы абравізавалі губэрскаю казначэйства і забралі там 400.000 руб. пакінуушы толькі так празываныя акупацыйныя грошы.

У Кіяу цягнуць усе контарравалюцанэры. Услед за кадэтамі туды паехау і вядомы хауруснік Карнілава Барыс Савінкау.

Голад у Нямеччыня большыцца і шырыцца. Нядауна у Бэрліня магістрат (нібы наша гарацкая дума) распарадзіуся выдаваць бульбы за мест 7 фун. на тыдзянь—толькі тры. З гэтых трох фунтау палавіна псутае.

У Амэрыцца выдан новы закон, па якому усе мужчыны з 21 па 31 год мусяць або ваяваць, або працаваць. У адным штаця (нібы наша губэрня) новы закон датыркая усіх мужчын, як бедных, гэтак і багатых, з 18 па 50 г.

У Харкавя кіраунічы кантораю „дзяржаунаго хлебнаго бюро“ павядаміу, што у горадзя хлеба хопіць толькі на 10 дзен, калі будуць выдаваць па чвэрца на душу... Немцы усе выкачалі!

На Капказі, нягледзючы на усякія „заміраньня“, якія парабілі з Турцыяй Грузыя і Арменя ідзе настаяшчая вайна. Турэцкая войска прэ на Тыфліс. Усюды валодаюць контарравалюцыйныя дружыны татарау ды пэрсау, якім старэнна памагаюць туркі.

Надоячы у Магілеускуй гарацкой думя абгаворвалася пытаньня аб прызнаньні Беларускай Рады. Пошля доугіх абгаворау пастаноуляна рады ня прызнаваць свайго пасланцоу да яе ня пасылаць, бо яна ня упаунамочана ад усяго беларускаго народу. Выказана агульная думка — што Беларусь незалежнай жыць ня можа.

Ф. ШАНТЫР. Патрэбнаць нацыянальнаго жыцьця ля беларусау і самаадзначэньня народау. Цана 80 коп.

Пад гэткім імям вядомы беларускі дзеяч т. Ф. Шантыр, выпусціу у сьвет сваю нявялічкую кніжачку, у якой іон падымая і разглядая досыць цікавая ня толькі ля кожнаго беларуса, а і усіх тых, хто цікуяцца досі маладым, але становячым дужа вагкім, беларускім пытаньнем. Накідаушы кароткі абрыс гістарычнаго становішча беларускаго народу і краю, ушы сваім тоя места, якоя іон займау у барацьбе с суседзямі, аутар пераходзіць да выявы тых асабістасцяу беларуса, якія ужыты у іом, як у прадстауніку асобнай, саматворачай нацыі, якую у сваіх інтарэсах, з аднаго боку польскія паны і клерыкалы, з другога—расейскія чыноунікі—а пад іх кірункам і буржуйныя гісторыкі, стараліся напакор законам жыцьця, звясці з яго арэны, пахаваць у тапіушы ці у польскую, ці у расейскую моры.

Апіраючыся на досі крэпкі фундамант, складзены з асобістых палажэньнях беларусам, як з мовы, звычаю і душы, т. Ф. Шантыр, выводзіць скутакъ што усе гэтыя асабістасці вымушаюць беларусау на заваіову сабе правоу на самаадзначэньня, як народу, поміж з другімі, роуными яму.

Блага адно, што аутар надта закопнау скваю, добра ім знаную, баларускую мову заграпічнымі славамі, якія робяць цяшкім чытаньня яго кніжкі. Да гэтаго яшчэ многа бракуя зус м нядбайнаго выданьня: друк мая нямерна абмылак, ды ад рознасці вялічыні літарау робіць вельмі немны выгляд, усе гэта-як прычыны тых варункау, у якіх прыходзілася друкаваць кніжку. Кошт кніжкі нядарагі па цяперашняму: кожны можа купіць... ды навіняп навэт.

Чытак.

Радактары:
З. Жылуновіч, Я. Петровіч.

Выдавец:
Беларускі Нацыянальны Камісарыят.

Типографія Сов. Раб. и Солд. Деп. Москва, Тверская, Мамоновскій пер., д. 12.